## 208 неплацельшчыкаў выселены са сваіх кватэр

**Колькасць жыхароў, якія маюць даўгі па аплаце за кватэру, паступова змяншаецца: калі на пачатак мінулага года такіх было 12 працэнтаў, то сёлета — ужо 10. Узровень бягучых плацяжоў павялічыўся з 97 да 99,8 працэнта.**

Як лічыць першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь Ляпуноў, гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы актыўнаму выкарыстанню даволі жорсткіх мераў у адносінах да неабавязковых грамадзян. Паводле статыстыкі, са сваіх кватэр былі выселены 208 сем'яў неплацельшчыкаў. Ім было прадастаўлена жыллё меншага метражу і камфортнасці. У адносінах да даўжнікоў на працягу мінулага года афармлена 27 тысяч выканаўчых надпісаў на 13 міліярдаў рублёў і 42 тыс. іскавых заяў на 24 млрд рублёў.

Такая палітыка, заўважыў Генадзь Ляпуноў, будзе праводзіцца і надалей. Агульная сума пратэрмінаванай запазычанасці на працягу мінулага года павялічылася з 37 да 39 мільярдаў рублёў. Гэта адбылося з-за таго, што ўзраслі жыллёва-камунальныя тарыфы. Таму пытанне неплацяжоў застаецца даволі вострым. Між тым, варта мець на ўвазе тое, што ў адпаведнасці з нормай, якая ўнесена ў праект новага Жыллёвага кодэкса, за даўгі з кватэр праз суд змогуць высяляць не толькі наймальнікаў, а і ўласнікаў жылля.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Леанід КРУПЕЦ, першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама:

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

# «УКЛАДАННІ Ў ЗДАРОЎЕ — ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ»

**Фізкультурай і спортам у Мінскай вобласці рэгулярна займаюцца больш чым 140 тысяч чалавек. Гэта амаль 10 працэнтаў насельніцтва цэнтральнага рэгіёна. А з улікам дзятвы, якая наведвае «фіз-ру» ў межах вучэбнай праграмы, выходзіць, што здаровы лад жыцця актыўна падтрымлівае кожны трэці жыхар сталічнай вобласці. Паказчык можа быць яшчэ вышэйшы — да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі выніковага пасяджэння калегіі ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама, якое прайшло ў Маладзечне.**

Укладанні ў галіну фізкультуры і спорту даволі важкія — летась на адпаведныя патрэбы з абласнога бюджэту выдзелена каля 31 мільярда рублёў. Як плануецца, сёлета яны ўзрастуць на 13 працэнтаў. За мінулы год у вёсках Міншчыны даведзены да ладу 34 футбольныя палі, 132 спартыўныя залы, 154 пляцоўкі, 3 міні-басейны. У Любанскім і Смалявіцкім раёнах узведзены фізкультурна-аздараўленчыя комплексы.

— Не менш важны момант — эфектыўнае, рацыянальнае выкарыстанне аб'ектаў — упэўнены першы намеснік міністра спорту і турызму Уладзімір Аляшкевіч, які ўзяў удзел у калегіі. — Неабходна забяспечваць патрэбу людзей у занятках спортам у кожны сезон, на працягу ўсяго года. Пакуль адпаведная ўніверсальная інфраструктура створана далёка не ўсюды. Таму аб'екты застаюцца незапатрабаванымі і прыносяць не прыбыткі, а страты. Гэта непрадуманае рашэнне. Пацвярджэннем таму — сітуацыя з цэнтрам «Сілічы», які доўгі час проста прастойваў без справы.

Спартыўная інфраструктура павінна выкарыстоўвацца «пад попыт». Як заўважыў начальнік аддзела па фізічнай культуры, спорту і турызму Салігорскага райвыканкама Міхаіл Малаш, толькі за чатыры дні ў раёне даход ад выкарыстання каткоў склаў 11 мільёнаў рублёў.

На думку Уладзіміра Аляшкевіча, школы павінны мець па некалькі спартыўных залаў, для чаго варта ўнесці пэўныя змяненні ў праекты новабудоўляў. Зразумела, рэгулярна патрэбна абнаўляць абсталяванне і спортінвентар. Летась на гэта на Міншчыне было выдаткавана 174,7 мільёна рублёў. Між тым, забяспечанасць застаецца даволі невысокай — у межах 40 працэнтаў ад неабходнай колькасці.

— У параўнанні з 2001-м годам колькасць школьнікаў зменшылася на 57,4 тысячы — амаль на чвэрць, — адзначае начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама Алег Качан. — Зразумела, паменела і колькасць тых, хто займаецца спортам. Негатыўны ўплыў аказвае і стан здароўя дзяцей. Усе гэтыя хранічныя, набытыя паталогіі ў выніку прыводзяць не да сістэматычных заняткаў спортам, а, у лепшым выпадку, лячэбнай фізкультурай.

У кожным садку Міншчыны ёсць уласны банк даных аб стане здароўя дзяцей, пастаянна праводзіцца аналіз захворваемасці, прымяняецца дыягностыка фізічнай формы, у адпаведнасці з чым малыя размяркоўваюцца па спецыяльных групах. На кожнага заводзіцца спецыяльны пашпарт здароўя. Больш чым 100 дашкольных навучальных устаноў цэнтральнага рэгіёна маюць фізкультурна-аздараўленчы і экалагічны ўхіл. У садках Міншчыны ладзяцца нават свае малыя алімпійскія гульні.

Сёлета цікавае і самае масавае за апошнія гады спартыўнае свята адбудзецца на Маладзечаншчыне — як паведаміў начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Маладзечанскага райвыканкама Мікалай Шрымф, тут пройдуць спаборніцтвы за званне самага футбольнага класа. У красавіку і маі літаральна ўсе тутэйшыя хлопцы школьнага ўзросту будуць змагацца за высокі тытул. У іх ёсць на каго раўняцца: чэмпіёнам і бронзавым прызёрам вышэйшай футбольнай лігі па выніках мінулага года сталі клубы Міншчыны — барысаўскі «БАТЭ» і салігорскі «Шахцёр». Дарэчы, спартсмены цэнтральнага рэгіёна летась дасягнулі значных поспехаў: на афіцыйных міжнародных спаборніцтвах (чэмпіянатах, першынствах, кубках свету і Еўропы) імі было заваявана 24 залатыя, 24 сярэбраныя і 35 бронзавых медалёў.

— Аднолькава важнае значэнне трэба надаваць развіццю як прафесійнага, так і масавага спорту, — адзначыў першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Леанід Крупец. — Здароўе чалавека — галоўная каштоўнасць, аснова эканомікі. Гэта адзін з дзяржаўных прыярытэтаў, трэба прыцягваць да рэгулярных заняткаў фізкультурай і спортам людзей усіх узростаў. Пад пільнай увагай — здароўе маладога пакалення, паколькі сёлета аб'яўлены Год дзіцяці. Чаго хаваць — ёсць пэўныя адмоўныя моманты (злачыннасць сярод непаўналетніх, алкагалізм, ужыванне наркотыкаў), якія, на жаль, пакуль не ўдалося да канца выкараніць. Трэба ствараць умовы для таго, каб кожны меў магчымасць цікава і з карысцю бавіць вольны час. Варта не забываць пра тое, што ўкладанні ў здароўе чалавека — сапраўдныя інвестыцыі ў будучыню.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*Мінск—Маладзечна—Мінск.*

Пытальнік

## Без згоды суседа аформіць участак будзе праблематычна. Але магчыма

**Жыву ў двухкватэрным жылым доме. На кожную кватэру існуе асобны тэхнічны пашпарт і дамавая кніга. Зараз вырашыў аформіць зямельны ўчастак на сваё жыллё, але мне адмовілі, бо гэта можна зрабіць толькі разам з суседам, які афармляцца не збіраецца. Што мне зараз рабіць?**

**І. АЎТУШКА,** г. Смалявічы.

— Справа ў тым, што зямельныя ўчасткі прадастаўляюцца ва ўласнасць ці пажыццёвае валоданне для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, — адказвае спецыяліст аддзела Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь. — А вось перадача зямельнага ўчастка для абслугоўвання кватэры ў блакіраваным жылым доме ці часткі жылога дома заканадаўствам не прадугледжана.

Для афармлення зямельнага ўчастка на агульным долевым праве для абслугоўвання адной капітальнай двухкватэрнай пабудовы яго ўласнікам неабходна звярнуцца ў адпаведны выканаўчы і распарадчы орган з заявай. У заяве павінны быць указаны віды права на зямельны ўчастак, а таксама долі зацікаўленых асобаў у гэтым праве. Разам з тым ёсць выпадкі, калі адзін ці некалькі ўдзельнікаў агульнай долевай уласнасці на капітальную пабудову невядомыя, не зацікаўлены або ўхіляюцца ад падачы заяў аб атрыманні зямельнага ўчастка.

З гэтага становішча можа быць іншае выйсце. Калі капітальная пабудова зарэгістравана ў вызначаным парадку, то І. Аўтушка неабходна заключыць з удзельнікамі агульнай долевай уласнасці дагавор аб падзеле капітальнай пабудовы, на падставе якога зарэгістраваць у тэрытарыяльнай арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, праву на яе і здзелак з ёю (у вашым выпадку Смалявіцкім бюро Барысаўскага філіяла РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру) стварэнне капітальнай пабудовы і ўзнікненне права ўласнасці на асобную капітальную пабудову (дом), пасля чаго аформіць адпаведны сфармаваны ў выніку падзелу зямельны ўчастак ва ўласнасць ці пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну.

У выпадку недасягнення згоды з удзельнікамі агульнай долевай уласнасці пры заключэнні дагавора аб падзеле дома гэтая спрэчка можа разглядацца ў судзе. Падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі стварэння капітальнай пабудовы і ўзнікнення права ўласнасці на яе ў гэтым выпадку будзе рашэнне суда.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Беларускі вінаград — для нелянівых скарб!

**— У нашай краіне ёсць месцы, дзе можна вырошчваць лепшыя ў свеце гатункі вінаграду. У прыватнасці, Брэсцкая і Гомельская вобласці, — расказвае карэспандэнту «Звязды» самы вядомы на Віцебшчыне вінаградар Віктар Кухараў. — Тут можна вырошчваць у першую чаргу, сталовыя гатункі. Віныя ж гатункі найбольш цяжкія, і асартымент пакуль у рэспубліцы мала вывучаны. Але ж я ўпэўнены, што і яны будуць асвоены. Дарэчы, па-сапраўднаму чысты сталовы вінаград, прыгодны для харчавання, нават у сонечнай Італіі лічаць за лепшае вырошчваць у парніках. Улічваючы, што ў нас няма тыповых вінаградных хвароб і мінімум шкоднікаў, вінаград, вырашчаны ў Беларусі, найбольш экалагічны...**



Вядомы беларускі спецыяліст па гэтай агракультуры Віктар Паўлавіч Кухараў на сваім участку зямлі ў Віцебскім раёне, пачынаючы з 1982 года, выпрабаваў больш за 300 гатункаў вінаграду. Яго ўчастак уключаны ў спецыяльную Дзяржаўную праграму «Стварэнне нацыянальнага генетычнага фонду гаспадарча карысных раслін Рэспублікі Беларусь». Нядаўна Віктар Паўлавіч — старшыня Віцебскага філіяла клуба «Паўночны вінаград» на міжнароднай канферэнцыі ў Латвіі (Юрмала) стаў правадзейным членам міжнароднай асацыяцыі вінаградарства паўночных краін. А летась яго прозвішча з'явілася ў выданні «Хто ёсць хто ў Беларусі? Дзелавы свет СНД-2006». Шмат гадоў ён з'яўляецца шчырым агітатарам вырашчвання вінаграду. Ён — аўтар дзесяткаў артыкулаў, а ў 2003-м годзе выйшла яго кніга «Вінаград — усе колеры вясёлкі». Вельмі рады Віктар Паўлавіч, што ў Беларусі цяпер шмат маладых вінаградараў. Не ўтойвае радасці, што адзін айчынны завод па вырабу він усё-такі зацікавіўся карысцю вырошчвання гэтай культуры «прама на месцах», і цяпер будзе свая лаза, свой вінаград, якаснае сапраўднае віно беларускага разліву.

Вінаградарам ён зацікавіўся амаль што выпадкова, калі пазнаёміўся з правадзейным членам маскоўскага таварыства выпрабавальнікаў прыроды Дзмітрыем Харытонавічам Токаравым. А потым са славутым расійскім вінаградарам Іванам Аляксандравічам Кастрыкіным. Апошні аказвае вялікую дапамогу ў развіцці вінаградарства Беларусі, з'яўляецца членам-карэспандэнтам міжнароднай акадэміі вінаградарства, двойчы лаўрэатам расійскай дзяржаўнай прэміі ў вобласці вінаградарства. Перадае для выпрабаванняў новыя гатункі, навуковую літаратуру, дапамагае саветамі. Падзяліўся вялікай колькасцю насення для закладкі сумеснага селекцыйнага ўчастка.

Разважае Віктар Кухараў: «На той жа канферэнцыі было параўнальна шмат прадстаўнікоў Канады. Ды і канадскі бок прафінансаваў большую частку выдаткаў. А ўсё таму, што ў гэтай краіне аддаюць перавагу гатункам вінаграду з ізабэльным прысмакам (з іх робяць т. зв. сталовыя віны) паэтапна замяніць на больш высакародныя. Канадцы плануюць поўнасцю самазабяспечвацца «высокімі» маркамі сухіх він. А мы маглі б у перспектыве зрабіць тое ж самае, толькі трэба пачаць займацца прамысловым вінаградарствам. Былі там спецыялісты з многіх краін, у тым ліку і з Кітая (унутраная Манголія)...».

З якіх гатункаў пачаць і не заблытацца? Вопыт падказвае, што ў нас у Беларусі гатункі з перыядам вегетацыі больш за 140 дзён не прыдатныя для вырошчвання нават у цяпліцы, а гатункі з перыядам вегетацыі больш за 125 дзён — для адкрытага грунту.

Гатунак «Маскоўскі ўстойлівы» да 32 градусаў марозу вытрымлівае. Укрываць не трэба пры тэмпературах мінус 25—30 градусаў «Карынку рускую». Добра зарэкамендавалі сябе пры паўночным клімаце «Алёшанкін», «Кіеўскі белы».

Вінаградным гатункам «усіх часоў і народаў» лічыцца «Захапленне», які з'явіўся ў 1993-м. Менавіта за яго Івану Кастрыкіну была прысуджана дзяржаўная ўрадавая прэмія. На сёння на аснове гэтага гатунку выведзена больш за 70 іншых гатункаў.

Зараз Віктар Кухараў працуе над серыяй альбомаў гатункаў вінаграду, што растуць у Беларусі. Усяго іх будзе чатыры. Калі зацікавяцца нашы чытачы, знакаміты вінаградар даў згоду падзяліцца на старонках «Звязды» сваімі сакрэтамі: якія этапы пры вырошчванні лазы, як правільна падрыхтаваць зямлю, як набыць саджанцы і падрыхтаваць іх да высадкі, колькі трэба мець вінаграду, каб забяспечыць сям'ю свежым, сушаным вінаградам, кампотамі і г.д. Пракансультавацца можна з вінаградарам па мабільнаму тэл. 628-30-42. Шчыра шкадуе спецыяліст, калі пачынаючыя дачнікі расчароўваюцца ў вінаградзе, бо, каб правільна выбраць тыя ж саджанцы, трэба давяраць таму, хто іх прапаноўвае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У лясных угоддзях пачынаецца вакцынацыя ад шаленства

**На працягу тыдня Міністэрства лясной гаспадаркі правядзе паміж абласцямі размеркаванне вакцыны ад шаленства.**

Нагадаем, што напрыканцы мінулага года было закуплена 235 тысяч дозаў вакцыны айчыннай вытворчасці ад шаленства, аднак пэўны час з-за анамальна цёплага надвор'я яна знаходзілася на захоўванні на спецыяльных складах. Выкарыстоўваць яе пры плюсавых тэмпературах не мела сэнсу. Справа ў тым, што па тэхналогіі вакцына ад шаленства ў вадкім выглядзе ўпрыскваецца ў прынаду, якая пасля замарозкі раскідваецца ў лясных угоддзях. Аднак пры плюсавой тэмпературы паветра, па-першае, сама прынада магла хутка сапсавацца і не прыцягнуць увагі драпежнікаў, па-другое, паколькі доўгі час снегу не было, лясныя звяры без праблем здабывалі сабе харчаванне і маглі не спакусіцца на яе. З надыходам жа стабільных мінусавых тэмператур надышоў час дзейнічаць.

— Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання прадаставіла нам даныя аб эпізаатычнай сітуацыі па шаленству за 2006 год па ўсіх абласцях як сярод хатняй жывёлы, так і дзікіх звяроў (маюцца на ўвазе найперш непажаданыя віды дзікіх жывёл — воўк, ліса, янотападобны сабака): колькасць зафіксаваных выпадкаў, тэрыторыі, — паведамілі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. — З улікам гэтых звестак агульная колькасць дозаў вакцыны ад шаленства і была прапарцыянальна падзелена паміж абласцямі.

Так, у Брэсцкую вобласць будзе накіравана 14 тысяч дозаў вакцыны, у Віцебскую — 42,5 тысячы, у Гомельскую — 28 тысяч, у Гродзенскую — 40 тысяч, у Мінскую і Магілёўскую вобласці — адпаведна амаль 59 і 52 тысячы дозаў. Далей вакцына будзе размеркавана па канкрэтных карыстальніках паляўнічых угоддзяў з улікам арандуемай плошчы і колькасці зафіксаваных выпадкаў шаленства. Вакцыну атрымаюць абсалютна ўсе карыстальнікі — і па лініі Мінлясгаса, і па лініі Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «БТПР», і ўсе іншыя (уключаючы ў тым ліку і тэрыторыі ўсіх запаведнікаў і заказнікаў). Каб не было ніводнай «белай плямы».

— На працягу месяца пасля гэтага разам з падкормкай дзікіх жывёл павінна быць праведзена вакцынацыя ў лясных угоддзях, — дадалі нам у міністэрстве. — Умовы гэтаму спрыяюць: мінусавая тэмпература і адсутнасць натуральнага корму (тых жа мышэй) для драпежнікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МЯДОВАЯ ЗАРПЛАТА

**Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. На сёння гэты крылаты выраз супярэчыць думкам сучаснай вясковай моладзі. Цяжка сустрэць выпускніка, які б марыў застацца працаваць у родным сельскагаспадарчым кааператыве. Не перспектыўна, адным словам. Але, што ні кажы, і там патрэбны маладыя і адказныя спецыялісты...**



*І ў пчол ёсць уласны тэрапеўт.*

У Віцебскай вобласці патрэба ў заатэхніках па пчалаводству. З заходніх раёнаў краіны мала хто з маладых людзей вырашае звязаць свой лёс з пчоламі. Паводле слоў вядучага спецыяліста па пчалаводству Міёрскага раёна (лідзіруе ў вобласці па колькасці пчоласем'яў: іх тут 525) Любові Танайны, гэта звязана, у першую чаргу, з нізкай зарплатай пчаляра. Але самае галоўнае, каб да справы ляжала душа. Не кожны зможа тут працаваць.

— У нашым раёне тры маладыя пчаляры: Міхаіл Шульга, Яўген Чарневіч і Артур Антанёнак. Міша ўжо самастойна адпрацаваў сезон на пасецы СВК «Чаромушкі». Я ўпэўнена, што гэты хлопец будзе добрым спецыялістам, — зазначыла Любоў Мікалаеўна. — Яўген і Артур, якія працуюць у СВК «Наўгароды», таксама стараюцца, прыслухоўваюцца да парад старэйшых...

Зімняя марозная раніца. З Яўгенам і Артурам крочу ў суседнюю вёску на пасеку. Адлегласць невялікая — усяго толькі 5 кіламетраў.

— Што можна рабіць зімой на пасецы? — здзівіла я хлопцаў сваім пытаннем.

— Без справы не сядзім, — гаворыць Яўген. — Зараз рыхтуемся да сезона. Чысцім рамкі, рамантуем пустыя вуллі.

— Зімой абавязкова трэба наведваць пасеку, слухаць пчол, ганяць мышэй, якія маюць моду зашывацца ў падушкі, якімі ўцяплілі вуллі, — дадаў Артур.

Акрамя гэтага, хлопцы расказалі, што зімой ім раз на месяц чытаюць лекцыі, каб не забывалі тэорыю.

— Нядаўна з сябрам размаўлялі пра тое, дзе і чым зарплату выдаюць, — узгадала я. — І малаком, і цукрам, і канцылярскімі таварамі. Цікава, а ў вашым кааператыве не практыкавалі тое ж самае зрабіць з мёдам?

— Так, — усміхаюцца, — улетку накачалі аж сем цэнтнераў таварнага мёду. Людзі бралі па літру ці два ў кошт зарплаты. Магчыма, бралі б і больш, але зарплаты маленькія. Сярэдні заробак складае каля ста тысяч рублёў, а літр мёду каштуе дзесяць тысяч рублёў.

За размовай не заўважылі, як апынуліся на пасецы. Дахі маленькіх домікаў убачылі яшчэ здалёк.

— Гэта ўзімку так, а як пацяплее — за зялёнымі кустамі іх нябачна, — зазначыў Яўген.

— І мосцік трэба будзе будаваць, бо так залье сцяжынку да вулляў, што не прайсці, — заклапочана дапоўніў Артур.

Хлопцы мараць павялічыць пасеку, хочуць, каб прывезлі болей вулляў.

— Старшыня кааператыва параіў мне ісці вучыцца на пчаляра, бо Антонавічу трэба было рыхтаваць замену, — першым пачынае аповед Яўген. — Пасля таго, як паступіў, дзядзька падарыў мне вулей. Я завёў дома пчол. На працягу 4 гадоў вучобы прыязджаў на практыку на сваю маленькую радзіму. Раней спраў з пчоламі не меў. Таму спачатку было вельмі страшна... Пайшоў у армію, адслужыў. Нават адпачыць не давялося. Трэба было качаць мёд.

Артур жа спачатку паспрабаваў працу пчаляра на ўласным «горбе», а пасля вырашыў падмацаваць практыку тэорыяй. У гэтым годзе ён паступіў у Смілавіцкі дзяржаўны аграрны каледж на завочную форму навучання.

— У суседа-ветэрынара была пасека. Але, калі ён пастарэў, аслаб, даглядаць пчол не стала каму, — расказвае Артур. — Аднойчы, калі я быў яшчэ малы, паспрабаваў выняць з вулля дзве рамкі. Захацелася мёду. Трошкі, праўда, пакусалі пчолы, але пашанцавала — спакойныя трапіліся. Гэта быў мой першы вопыт.

Пасля, калі вучыўся ў 10-м класе, бабуля сказала, што Яўген у арміі, Івану Антонавічу трэба падмога. Вось Артур і пачаў кожны дзень хадзіць на пасеку. Падабалася. Бывала, улетку адразу пасля дыскатэкі засынаў ля вулля.

У школе ўсе ведалі, што ён працуе пчаляром. Таму нядзіўна, што на 23 лютага аднакласніцы падарылі кубак з пчоламі і паштоўку з мядзведзямі.

— Два гады, пакуль вучыўся ў школе, я дапамагаў дзеду, — гаворыць Артур. — А зараз дапамагаю Яўгену. Разам весялей.

Пасля таго, як хлопцы пераканаліся, што ўсё даведзена да ладу, паказалі мне на хатку ў некалькіх метрах ад пасекі.

— Тут жыве наш Антонавіч, — тлумачыць Яўген і прапаноўвае нам з Артурам праведаць яго.

Знайшлі Івана Антонавіча на двары, ён ладзіў воз.

— О, ужо мне нявестачку прывялі, — жартуе ён, разглядаючы мяне.

— Не, я пра вас пісаць буду, — прамовіла з усмешкай на твары.

Івану Антонавічу ўжо 78 гадоў. Амаль палову з іх прысвяціў калгаснай пасецы, дзе больш за 70 пчоласем'яў.

— Ці не боязна вам было аддаваць сваё багацце ў рукі маладых, нявопытных?

— Я іх усяму, што ўмеў, навучыў, — пераконвае Іван Антонавіч. — Узрост ужо не малады. Цяжка мне было. На працы — пчолы, дадому прыходзіш — і там яны. Перад тым, як даверыць Яўгену гаспадарку, мы абышлі ўсе вуллі (каб праверыў, а мо там карова сядзіць *(смяецца)*.

— Іван Антонавіч, а як вы з укусамі змагаецеся, можа, забабоны якія маюцца?

— А ніяк. Нягледзячы на тое, што пчолы сваіх людзей пазнаюць, усё роўна кусаюць. За дзень можа ўкусіць 30—40 пчол, — гаворыць пчаляр. — А я і рады. Бо так падлячыў радыкуліт. А да гэтага што толькі ні рабіў — і ў Сочы ездзіў, і лекі прымаў — нічога не дапамагала...

— Чым цішэй ты сябе паводзіш, тым большая верагоднасць, што пчолы цябе не крануць, — дадаў Артур. — Улетку жанчыны дапамагалі качаць мёд. Усе бывалыя, бо даводзілася гэтым займацца не раз, а маладая дзяўчына прыйшла на пасеку ўпершыню. Баялася. Смешна было назіраць, як Юля, калі пчала заблыталася ў яе валасах, танчыла ля вулляў і крычала. Не ведала яна, што чым больш крычыш, тым больш злуеш пчол.

Развітаўшыся з Іванам Антонавічам, мы пакрочылі дадому па знаёмай ужо дарозе (10 кіламетраў у дзень — і не трэба думаць пра дыету).

— Мой сябар есць мёд лыжкамі. А ці любіце вы, пчаляры, мёд? — пытаюся.

— Ну, так сабе, — прамовілі хлопцы амаль у адзін голас. — За дзень ён так надакучыць. Дадому прыходзіш увесь ліпкі і салодкі. Ды яшчэ, часам, і пчалу ў кішэні прынясеш (і па інерцыі абмацалі кішэні).

Пры ўваходзе ў Наўгароды нас сустрэў шэраг новых цагляных домікаў (калі ішлі на пасеку, я на іх не звярнула ўвагі).

— Гэта аграгарадок — злавіўшы мой цікаўны позірк, патлумачыў Яўген. — Тут Артуру, як маладому спецыялісту, далі кватэру. Спадзяюся, у хуткім часе я таксама буду адзначаць наваселле.

**Надзея ДРЫЛА,**
**Фота аўтара.**
*Міёрскі раён.*



*Артур запрашае на наваселле.*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007

*ОАО «Лифтсервис»*
**УНП 100088852**
*220033 г. Минск-33, 1-й Велосипедный пер. 5*

*млн. руб.*

| *АКТИВ* | *Код стр.* | *На начало отчетного года* | *На конец отчетного периода* |
|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* |
| **I. Внеоборотные активы** | | | |
| Основные средства (01, 02) | 110 | 1 583 | 1 941 |
| Нематериальные активы (04, 05) | 120 | 1 | 1 |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ I | 190 | 1 584 | 1 942 |
| **II. Оборотные активы** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 432 | 499 |
| В том числе: сырье, материалы и другие ценности (10, 14, 15, 16) | 211 | 432 | 499 |
| Налоги по приобретенным ценностям (18, 76) | 220 | 3 | |
| Дебиторская задолженность | 250 | 2 069 | 2 556 |
| В том числе: расчеты с покупателями и заказчиками (62, 63) | 251 | 1 948 | 2 494 |
| расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76) | 253 | 35 | 62 |
| прочая дебиторская задолженность | 254 | 86 | |
| Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57) | 270 | 88 | 436 |
| ИТОГО ПО ПОДРАЗДЕЛУ II | 290 | 2 592 | 3 491 |
| **Баланс** | **390** | **4 176** | **5 433** |
| *ПАССИВ* | *Код стр.* | *На начало отчетного года* | *На конец отчетного периода* |
| **III. Источники собственных средств** | | | |
| Уставный фонд (80) | 510 | 40 | 40 |
| Добавочный фонд (83) | 530 | 1 561 | 1 935 |
| Нераспределенная прибыль (84) | 540 | 2 260 | 2 547 |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ III | 590 | 3 861 | 4 522 |
| **IV. Доходы и расходы** | | | |
| Расходы будущих периодов (97) | 620 | -13 | -11 |
| Доходы будущих периодов (98) | 630 | | 39 |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ IV | 690 | -13 | 28 |
| **V. Расчеты** | | | |
| Кредиторская задолженность | 730 | 328 | 883 |
| В том числе: расчеты с поставщиками и подрядчиками (60) | 731 | 21 | 5 |
| расчеты по оплате труда (70) | 732 | 148 | 415 |
| расчеты по налогам и сборам (68) | 734 | 39 | 182 |
| расчеты по социальному страхованию и обеспечению (69) | 735 | | 179 |
| расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76) | 737 | 120 | 102 |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ V | 790 | 328 | 883 |
| **Баланс** | **890** | **4 176** | **5 433** |

| *Справка о наличии ценностей, учитываемых на забалансовых счетах* | *На конец отчетного периода* |
|---|---|
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств (010) | 54 |

**Руководитель Ботян М.М.**
**Главный бухгалтер Шорец С.Ф.**

## Крымінал

### ХАЛАТНАСЦЬ НА 214 МЛН

**Крымінальная справа па прыметах злачынства, прадугледжанага ч.1 арт. 428 КК — «Службовая халатнасць», узбуджана Крычаўскім міжрайаддзелам Упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці ў адносінах да намесніка дырэктара РУП «Крычаўскі завод гумавых вырабаў».**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, гэта службовая асоба ў маі мінулага года пры заключэнні дагавора пастаўкі прадукцыі з расійскім ТАА «Трыумф» з Іванава не праверыла належным чынам плацежаздольнасць партнёра і дала ўказанне на адгрузку ў яго адрас партыі абутку пры наяўнасці запазычанасці таварыства перад заводам па папярэдніх здзелках. Як вынік, дзяржаве нанесены ўрон у асабліва буйным памеры ў выглядзе непаступлення грошай ад экспарту тавараў на 2,7 млн расійскіх рублёў, што па курсу Нацбанка склала 214,9 млн рублёў.

### ПАДВЯЛА ВАЛЮТА...

**На мабільніках і на гандлі таварам за валюту «прагарэў» індывідуальны прадпрымальнік з Баранавічаў.**

Справа ў тым, што супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Баранавіцкага ГАУС, праводзячы кантрольную закупку мабільнага тэлефона на рынку «Кааператыўны» ў 36-гадовага бізнэсмена, выявілі факт рэалізацыі тавару за валюту. У выніку парушальнік страціў і грошы, што меў пры сабе, і мабільныя тэлефоны, што рэалізоўваліся без сертыфікату адпаведнасці. Усяго ў прадпрымальніка было канфіскавана 4 тысячы расійскіх рублёў, 1 мільён 775 тысяч беларускіх, 95 долараў ЗША і 62 мабільныя тэлефоны на 21 мільён 606 тысяч рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ТРОЕ СА СКРЫНЯМІ...

**У 15.20 у Мінскі аддзел Дэпартамента аховы паступіла інфармацыя, што магчымы крадзеж з базы, якая знаходзіцца ў п. Калодзішчы Мінскага раёна.**

Супрацоўнікі аддзела — прапаршчык міліцыі Аляксандр Паныш і старшына Аляксей Рубацкі — прыбылі да аб'екта і ад вартаўнікоў суседняй базы даведаліся, што трое невядомых, якія пад'ехалі на аўтамабілі «Опель-Амега», выносілі нейкія скрыні. Удакладніўшы прыметы падазроных, міліцыянеры ўжо праз дзесяць хвілін на чыгуначным пераездзе заўважылі аўтамабіль, які вышукваўся. Падчас вобыску ў багажніку былі знойдзены выкрадзеныя скрыні з медным кабелем. Затрыманымі аказаліся непрацуючыя, раней судзімыя жыхары Мінска, якія на дзень раней на тым жа аб'екце ўчынілі крадзеж буйной партыі кабелю. Агульны ўрон склаў больш за 13,5 мільёна рублёў.

**Аляксандр ЧАРНЯЎСКІ.**

## ЯПОНІЯ ПАДАРЫЛА ГРОШЫ РАЁННЫМ БАЛЬНІЦАМ

**Суму ў 213,3 тысячы долараў атрымаюць раённыя бальніцы ў Слаўгарадзе, Быхаве і Касцюковічах. Гэтыя грошы выдаткоўвае ўрад Японіі ў межах рэалізацыі праграмы «Грантавая дапамога для праектаў бяспекі насельніцтва». Дакументы аб прадастаўленні гранта падпісалі 9 лютага ў Магілёве часовы паверань у справах Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Коікэ Такаюкі і старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура.**

Цэнтральныя бальніцы ў трох раёнах Магілёўшчыны, якія пацярпелі ў выніку чарнобыльскай катастрофы, набудуць на выдаткаваныя Японіяй грошы медыцынскае абсталяванне.

Кіраўніцтва вобласці ўпэўнена, што гэта будзе спрыяць паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі, і выказала просьбу аб стажыроўцы ў Японіі беларускіх кардыяхірургаў і анколагаў. Аблвыканкам таксама спадзяецца на супрацоўніцтва з японцамі ў эканамічнай сферы і прапанаваў арганізаваць знаёмства для японскіх дзелавых колаў з патэнцыялам рэгіёна.

**Алена КАЗЛОВА.**

БЕЛАРУСБАНК
АСБ «БЕЛАРУСБАНК» ИНФОРМИРУЕТ,
*что с 12 февраля 2007 года изменились процентные ставки по вновь выдаваемым физическим лицам кредитам на потребительские нужды в иностранной валюте.*
Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка
**www.belarus-bank.by**.
*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

## Надзея ЕРМАКОВА: «КРЭДЫТНЫЯ СТАЎКІ ПАД БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ ЗАСТАЮЦЦА НА РАНЕЙШЫМ УЗРОЎНІ»

**Праўленнем ААБ «Беларусбанк» былі падведзены вынікі дзейнасці за 2006 год. Адзначалася стабільная і роўная работа банка, калі летась гэтая фінансавая ўстанова ўпершыню ажыццяўляла сваю дзейнасць без прэферэнцый з боку Нацыянальнага банка Беларусі.**

Як паведаміла журналістам старшыня праўлення ААБ «Беларусбанк» Надзея Ермакова, летась банкам былі выкананы ўсе нарматыўныя паказчыкі і нават перавыкананы параметры грашова-крэдытнай палітыкі. Па выніках дзейнасці за мінулы год буйнейшы банк краіны атрымаў прыбытак у памеры 122,7 млрд рублёў, што амаль у тры разы больш, чым за папярэдні перыяд. Істотна павялічылася рэнтабельнасць прадпрыемства, якая летась склала 10,2 працэнта.

Памер прыцягнутых ААБ «Беларусбанк» рэсурсаў на пачатак гэтага года ў эквіваленце ўсіх валют дасягнуў 10 953,8 млрд рублёў, у тым ліку сродкі фізічных асобаў — 4893,7 млрд рублёў. Усе актывы банка складаюць зараз 12 783,4 млрд рублёў.

Вядомы эканамічны часопіс «The Banker» прысудзіў ААБ «Беларусбанк» узнагароду «Банк года» ў Беларусі, што адлюстроўвае паспяховую дзейнасць банка ў якасці надзейнага партнёра не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Так, па аб'ёму фінансавых актываў банк займае 261-е месца сярод буйнейшых банкаў Еўропы і ўваходзіць у лік 50 буйных банкаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

На міжнародным фінансавым рынку ААБ «Беларусбанк» летась прыцягнуў два сіндыцыраваныя крэдыты і тры прамыя міжбанкаўскія крэдыты ў агульным аб'ёме каля 125 млн долараў ЗША ў эквіваленце. Паспяховы дэбют банка ў гэтай сферы адкрыў замежным інвестарам новы перспектыўны накірунак па крэдытаванню буйных беларускіх банкаў. Сёння ААБ «Беларусбанк» збіраецца ўпершыню прапанаваць на міжнародным банкаўскім рынку так званую еўрааблігацыю. Па лініі аблігацыйнай пазыкі банк разлічвае атрымаць сёлета не менш як 100—200 млн USD замежных сродкаў.

Сёлета ашчадны банк краіны мяркуе істотна актывізаваць развіццё безнаяўных разлікаў ва ўсіх сферах спажывання з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. Прагназуецца, што пластыкавыя карткі пачнуць функцыянаваць у сельскіх населеных пунктах ужо ў гэтым годзе.

Адказваючы на пытанні карэспандэнта «Звязды», Надзея Ермакова адзначыла, што з лютага кошт асобных крэдытаў банка для насельніцтва ў беларускіх рублях павялічыўся. Гэтае павелічэнне невялікае і складае максімум 1—2 працэнты. Падаражанне крэдытаў звязана з павелічэннем стаўкі рэфінансавання Нацбанка на 1 працэнтны пункт. Павелічэнне крэдытных ставак па крэдытах на спажывецкія патрэбы звязана з тым, што павялічыўся кошт грашовых рэсурсаў. Адпаведна, павялічыліся працэнтныя стаўкі па ўкладах насельніцтва. Крэдытныя стаўкі пад будаўніцтва жылля застаюцца на ранейшым узроўні. Надзея Ермакова запэўніла, што ААБ «Беларусбанк» з'яўляецца самым надзейным банкам Беларусі. Гэтаму сцвярджэнню служыць той факт, што за апошнія 16 дзён снежня 2006 года насельніцтва паклала на дэпазіты «Беларусбанка» каля 124,9 млрд рублёў.

Старшыня праўлення ААБ «Беларусбанк» адзначыла, што для больш якаснага абслугоўвання кліентаў фінансавай установы сёлета банкам запланавана ўстанавіць больш за 150 банкаматаў і 200 інфакіёскаў (больш за палову з якіх — у невялікіх населеных пунктах).

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПРАБЛЕМА НЕ Ў СЭКСЕ. А Ў ЯГО АДСУТНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— У еўрапейскіх краінах урачы таксама канстатуюць зніжэнне цікавасці да гэтага боку жыцця... А можа — ну і Бог з ім? Ну што чалавек губляе? Няхай разводзіць кактусы. Ці зарабляе грошы.**

— Ды калі ласка! У такім выпадку мы гаворым аб сублімацыі сэксуальнай энергіі — яна расходуецца на дасягненне іншых задавальненняў. Але як толькі мужчына пачынае жыць палавым жыццём радзей, чым патрабуюць яго палавая канстытуцыя і ўзрост, з ім адбываецца тое ж, што і са спартсменам, які пачынае радзей трэніравацца. Арганізм «растрэніроўваецца». У сэксалогіі існуе нават такое паняцце, як сэксуальная дэтрэніраванасць. Такія працяглыя перапынкі асабліва небяспечныя пасля 40 гадоў. Калі тыднямі і месяцамі ў чалавека адсутнічае палавое жыццё, палавая сістэма «кансервуе» сябе да мінімальнага ўзроўню. Яна не даходзіць да нуля, але каб аднавіць яе, спатрэбяцца час, намаганні і пераадоленне няўдач у адносінах з канкрэтным партнёрам — у дадзеным выпадку з жанчынай, якая павінна ўсё гэта вытрымаць. А вытрымліваюць далёка не ўсе і не заўсёды, што, у сваю чаргу, яшчэ больш прыгнятае мужчыну... Атрымліваецца замкнёнае кола.

«Размыкаецца» яно, калі ў мужчыны паяўляецца іншая жанчына. Тым больш што сёння з гэтым няма праблем.

**— Вы маеце на ўвазе, што жанчыны ў апошні час моцна знізілі «планку»?**

— Гэта ж відавочна! Многія жанчыны пачалі жыць па «мужчынскаму сцэнарыю». Яны не імкнуцца выйсці замуж, стварыць сям'ю, іх цікавіць толькі ўласнае задавальненне. Аргазм стаў самамэтай — я не кажу для ўсіх, але для вельмі многіх жанчын. Успомніце фільм «Сэкс у вялікім горадзе»: «Ты з Джонам сустракаешся? — Не, я з ім сплю».

Разумееце, што адбылося? Мужчыны выкупілі (!) сэкс ва ўласных жонак. Ён зарабляе грошы і час ад часу ходзіць «налева», а яна траціць грошы. І сэкса ў іх як такога няма, і ўрач-сэксолаг непатрэбны.

**— Добра, калі такая «гармонія» — яму не хочацца, а ёй і не трэба — задавальняе абодвух. А калі не?**

— Тады канфлікт. І такіх сем'яў многа, і дысгармоній многа. Як з імі спраўляцца? Калі ёсць сілы і энергія, людзі разводзяцца, спрабуюць стварыць новую сям'ю. Але часцей за ўсё, застаючыся ў шлюбе, заводзяць новага партнёра, які здымае «напружанасць». Ну, на самай справе, навошта рэзаць курыцу, якая нясе залатыя яйкі? Калі муж зарабляе грошы і яму не да сэксу, навошта яго тэрарызаваць, нерваваць?.. Таму, я думаю, колькасць пазашлюбных сувязяў будзе ўзрастаць — адпаведна таму, як будзе ўзрастаць наша жаданне працаваць на «залатога цяльца».

**— У амерыканцаў, напрыклад, прынята абмяркоўваць у сям'і любую дробязь, не кажучы ўжо пра сэксуальныя праблемы: «Давай пра гэта пагаворым...».**

— Гэта не наш метад. І традыцыі не тыя, і менталітэт. І наша стрыманасць невыпраўная перашкаджае... Пагаварыць — гэта спроба напісаць з двух «сцэнарыяў» адзін. Але кагосьці задавальняе менавіта яго сцэнарый, і ён не жадае падладжвацца пад іншага. Чалавеку з нашым менталітэтам прасцей агаліць цела, чым душу. Да мяне на прыём (кабінет знаходзіцца ў Мінскім абласным псіханеўралагічным дыспансэры. — **Н.К.**) прыходзіць звычайна нехта адзін — муж ці жонка. І калі я прашу прывесці партнёра, часта чую ў адказ: «А ён не прыйдзе, яму і так добра». Але ж гармонія адносінаў — гэта справа дваіх. Як можна пісаць агульны сцэнарый, не ведаючы, што хоча атрымаць ці аддаць твой партнёр?

**— Зніжэнне патэнцыі паддаецца лячэнню?**

— Натуральна! Тут шмат залежыць ад прычыны. Ці гэта дэтрэніраванасць, ці сасудзістая паталогія, ці псіхалагічныя варыянты. Напрыклад, ёсць выпадкі, калі жанчына ў сям'і практыкуе «кастрыруючыя паводзіны» — інакш кажучы, паводзіць сябе так, што ў падобнай сітуацыі ні адзін мужчына не здолеў бы нічога зрабіць.

Мне за ўсе трыццаць тры гады практыкі толькі адзін пацыент расказваў, як, прыйшоўшы дадому і заспеўшы жонку з палюбоўнікам, выкінуў саперніка за дзверы і завяршыў ім пачатае. Ад злосці, напэўна... Бывае, жанчына пачынае выказваць пастаянныя (часта неабгрунтаваныя) прэтэнзіі мужчыну наконт таго, што той яе не задавальняе... Зведваючы пачуццё віны, мужчына імкнецца кампенсаваць свае «збоі» фінансавымі ўліваннямі, дарагімі падарункамі. Што і патрабавалася яго «палове».

**— Свет становіцца матэрыяльна залежным...**

— А людзі ператвараюцца ў індывідуалістаў. Раней жанчыны запісваліся на прыём разам са сваімі мужчынамі, хваляваліся за іх, суперажывалі... Я гэтага суперажывання гадоў дзесяць ужо не бачыў! І з кожным годам неразуменне, аддаленне адно ад аднаго робіцца ўсё большым, на жаль. У людзей ёсць агульны ложак, агульныя дзеці і агульны бюджэт, але кожны жыве сваім жыццём. Я нават не маю на ўвазе наяўнасць палюбоўнікаў і палюбоўніц — проста свае інтымныя перажыванні кожны хоча трымаць у сабе... На ўрача ж, на кансультацыю і тым больш на лячэнне трэба патраціць час і грошы... Лепш мы спачатку купім машыну, футра жонцы, з'ездзім у адпачынак... А потым ужо звернемся да спецыяліста са сваімі праблемамі. Але пакуль надыходзіць гэта «потым», шлюб ці саюз развальваецца...

**— Сэксуальная, сэксапільная жанчына — гэта небяспечна?**

— Скажу, што сэксапільная жанчына сэксапільнай жонкай быць не можа — інакш шлюб будзе суправаджацца пастаянным пачуццём рэўнасці і «разборкамі».

**— А па якіх «параметрах» мужчына вызначае ў натоўпе сэксапільную жанчыну?**

— Па-першае, існуюць нейкія агульныя стандарты, скажам, той жа «90х60х90». Вы думаеце, жанчына прыцягвае мужчыну чым?

**— Я думаю, поглядам... Характарам, інтэлектам...**

— Ну што вы! Мужчына ў вочы не глядзіць. Дакладней, глядзіць, але далёка не адразу... Не вельмі сталы мужчына з нармальнай сэксуальнай арыентацыяй першыя 11 секунд разглядае жаночую постаць. Калі агульныя абрысы яго задавальняюць, з'яўляецца патрэба разглядзець «аб'ект» больш падрабязна, у дэталях. І далей мужчына «пераключаецца» на ягадзіцы, ногі, грудзі, талію, твар... Калі ўсё гэта адпавядае яго ідэалу, ён ідзе далей. Першапачатковая задача любога мужчыны — як мага хутчэй перавесці аблюбаваны «аб'ект» у гарызантальнае становішча.

**— Як прымітыўна...**

— Але гэта праўда і — што важна — праўда, навукова даказаная... Што далей? Мужчына атрымаў задавальненне і зразумеў, што за прыгожай «шыльдай» нічога цікавага няма. Ён пастараецца ад яе пазбавіцца, не паспеўшы нават спытаць нумар тэлефона. Калі жанчына думае, што яе могуць пакахаць за веданне тэхнікі аральнага сэксу — глыбока памыляецца. У такім выпадку яна становіцца не каханай, а... зручнай. А гэта розныя рэчы. Патрэба разабрацца — каго ж я сустрэў? — узнікае ў мужчыны далёка не адразу. Але калі жанчына падчас першага (другога, трэцяга) спаткання ў адказ на недвухсэнсоўную прапанову гаворыць новаму знаёмаму «не», ён вымушаны неяк падтрымліваць зносіны... Вось тады і пачынаецца разуменне, што ў яе ёсць не толькі ногі і грудзі. Прыходзіць закаханасць...

**— Інакш кажучы, слова «не» па-ранейшаму актуальнае?**

— Безумоўна. Хоць прадбачу «пытанне з залы»: як доўга трэба гаварыць «не»? Звычайна адказваю: тры тыдні і два дні. Жарт, канешне. Ніякіх крытэрыяў тут няма, гэты момант трэба адчуць самому. Магчыма, ёсць сэнс сказаць мужчыну «так» праз дзесяць хвілін — бо раптам гэта той самы «ўдар маланкі»? Я не ведаю...

Але сёння — я ўжо ўзгадваў пра гэта — адбываецца такая ролевая трансфармацыя: жанчына паводзіць сябе па мужчынскаму сцэнарыю, сама актыўна знаёміцца і выбірае партнёра, сама прапаноўвае ложак... Такія паводзіны ідуць супраць прыроды і нічым добрым не заканчваюцца. Калі жанчына пачынае бегаць за мужчынам, я кажу ёй: прырода зрабіла так, што самка можа злавіць толькі слабага самца. А злавіўшы, будзе пакутаваць, таму што атрымае заціснутага і падаўленага партнёра.

**— А нашы мужчыны сэксуальна прывабныя?**

— Мне больш падабаюцца жанчыны — яны ўмеюць сябе падаць. Ідучы па вуліцы, можна і галаву згубіць... Шкада, што ўвесь негатыў многія з іх нясуць менавіта дадому. А ў парадак сябе прыводзяць, выходзячы з дому.

**— У нас увогуле лічыцца, што пасля 40 гадоў на сэксуальных адносінах можна ставіць крыж...**

— Ды ні ў якім выпадку! Чаму кажуць: «сівізна ў галаву, чорт у рабрыну»? Не таму, што мужчына сталее. А таму, што пачынае ўсведамляць: ні ён, ні сэкс жонцы нецікавыя. У яе з'явіліся больш «актуальныя» праблемы: сёлета мы закаталі на дваццаць слоікаў агуркоў меней, чым у мінулым годзе... Пастаянна трэба некуды ехаць, нешта капаць, збіраць... Вось і шукаем тых, хто бачыць у нас мужчын, думае пра нас як пра мужчын. Я збіраюся напісаць кнігу, якая будзе называцца «Сівізна ў бараду» — якраз пра гэта. Там будзе эпіграф: «Мужчына не старэе, эякулірuючы». Вось так, ні больш ні менш.

**— Але, пражыўшы з чалавекам 20—25 гадоў, наўрад ці будзеш зведваць тое, што раней...**

— Так, вострае прыцягненне праз 4—5 гадоў праходзіць. Але да гэтага часу трэба знайсці ў партнёры іншыя «моманты», якія цябе чапляюць, задзейнічаць новыя каналы стымуляцыі. Таму, напэўна, самае вялікае майстэрства для жанчыны — навучыцца спакушаць уласнага мужа. Прымушаць сябе не трэба — павінны быць натуральнае жаданне, пасыл.

Нельга зводзіць сэксуальную сферу да ўзроўню кактусаў і агуркоў ні па прычыне ўзросту, ні па якіх-небудзь іншых прычынах.

**— А што неабходна для добрага сэксу?**

— Для пачатку — жаданне ім заняцца. Ну а потым разуменне таго, што побач знаходзіцца блізкі і родны чалавек, перад якім можна агаліць не толькі цела, але і душу. І, агаліўшыся, быць упэўненым, што табе не зробяць балюча.

**Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.**

### Тэніс. Кубак Дэвіса

## Беларусам не давялося накрыць пераможны шведскі стол



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Матч сусветнай групы 1/8 фіналу Кубка Дэвіса паміж камандамі Беларусі і Швецыі на мажорнай ноце завяршыўся на карысць гасцей: па выніках трохдзённай барацьбы скандынавы выйгралі 3:2.**

Калі быць больш справядлівым, то гэтыя лічбы на табло, якое пад канец сустрэчы Мірны—Содэрлінг , што завяршылася перамогай шведа 3:2 (6:7, 7:5, 6:7, 7:6, 6:3), на некалькі хвілін «зaела» і паказвала нулі, у некаторай ступені можна ўспрымаць як частковы аванс ад шведаў. Як-ніяк, а апошняе ачко беларусам намаганнямі Уладзіміра Валчкова ў матчы супраць Томаса Ёхансана дасталося без вялікіх фізічных затрат, хоць перамога (2:0) ёсць перамога, таму заключны паядынак з такім вялікім майстрам ні ў якім разе не прыніжае значнасць выйгрышу Валчкова.

Сёння можна толькі шкадаваць, што лідар беларускай каманды Максім Мірны не змог дацiснуць свайго саперніка, загнаўшы таго ў вугал. Два матчболы беларуса, калі ўжо пушкінскія радкі «Ура! Мы ломім, гнуцца шведы» пайшлі «гуляць» па душы кожнага балельшчыка, на жаль, не змаглі псіхалагічна зламаць маладога шведа. Прафесіянал змог сабраць свае нервы ў кулак і перавесці гульню ў пятую партыю. Далей давесці справу да перамогі яму дапамагла не столькі псіхалагічная перавага, колькі запас фізічных сіл. Як-ніяк, а Мірны гуляў тры дні запар, у той час яго сапернік меў цэлы дзень адпачынку.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі шведскі госць выглядаў бадзёрым і не хаваў радасці. Гэта быў цудоўны матч, адзначыў Содэрлінг. Што думаў у чацвёртым сэце? Нічога асаблівага, сказаў швед, сабраўся і проста гуляў як звычайна.

Максім Мірны ў пакоі для прэс-канферэнцый з'явіўся значна пазней за свайго «крыўдзіцеля». Я зрабіў усё што мог, адзначыў Мірны. Адчуваў сябе нядрэнна, але ў рэшце рэшт сказалася фізічная стомленасць. Псіхалагічнай няўстойлівасці не было, падкрэсліў Мірны, бо балельшчыкі ўвесь час мяне «падзараджалі».

Шведы прайшлі ў чвэрцьфінал, дзе ўжо дома ў пачатку красавіка сустрэнуцца з аргенцінцамі, якія перамаглі ў гасцях аўстрыйцаў — 4:1. Нам жа давядзецца чакаць жараб'ёўкі, каб ведаць свайго саперніка ў верасьнёўскім матчы плэй-оф.

*Вынікі астатніх матчаў 1/8 фіналу Кубка Дэвіса: Чылі—Расія — 2:3, Францыя—Румынія — 4:1, Германія—Харватыя — 3:2, Бельгія—Аўстралія — 3:2, Чэхія—ЗША — 1:4, Швейцарыя—Іспанія — 2:3. Іншыя чвэрцьфінальныя пары выглядаюць наступным чынам: Расія—Францыя, Германія—Бельгія, ЗША—Іспанія.*

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

### СХАПІЛІ ЗА РУКУ

Грамадзянін Расіі зайшоў у кабінет намесніка начальніка Маларыцкага РАУС, а там яго ўжо чакалі. Жыхар Дагестана прапанаваў 500 долараў за «ціхае» вяртанне аўтамашыны, якую ў яго раней забралі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### МАЗ АБНАЎЛЯЕ АЎТОБУСНЫЯ ПАРКІ КРАІНЫ І БУДЗЕ ВЫРАБЛЯЦЬ АЎТАМАБІЛІ КЛАСА ЕЎРА-4

**Летась Мінскі аўтамабільны завод выпусціў 1692 аўтобусы, што амаль на 700 адзінак больш, чым за папярэдні год. Як паведаміў рэдакцыі начальнік упраўлення продажу пасажырскай тэхнікі РУП «МАЗ» Аляксандр Хаміцэвіч, аўтатранспартнымі прадпрыемствамі рэспублікі за 2006 год было набыта 777 аўтобусаў, або ўдвая больш, чым за папярэдні год.**

Сёлета сталічны аўтамабільны завод плануе павялічыць вытворчасць і рэалізацыю пасажырскай тэхнікі да 1800 адзінак. Толькі прадпрыемствам аўтамабільнага транспарту РБ сёлета плануецца паставіць 526 адзінак пасажырскай тэхнікі.

Мінскі аўтазавод за мінулы год прадаў 21 214 грузавых аўтамабіляў, 8015 адзінак прычапнйй аўтатэхнікі і 450 аўтакранаў. Сёлета МАЗ разлічвае выпусціць 22 300 аўтамабіляў і 8400 адзінак прычапной тэхнікі. Летась сталічным прадпрыемствам выраблены першыя ўзоры аўтамабіляў класа Еўра-4, якія былі прадстаўлены на Маскоўскім аўтасалоне. Ужо з другой паловы 2007 года кіраўніцтва завода плануе рэалізоўваць машыны гэтага класа айчынным перавозчыкам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЗВЯРОЎ ПАДЛІЧАЦЬ ПА СЛЯДАХ

**З надыходам халадоў усе мядзведзі, а іх у краіне каля сотні, ляглі ў спячку, паведаміў карэспандэнту «Звязды» вядучы інжынер па паляўнічай гаспадарцы Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Бычкоў.**

Прынамсі, ва ўгоддзях апошнім часам не выяўлена слядоў касалапых. Нагадаем, што даволі працяглы час з-за анамальна цёплых умоў надвор'я мядзведзі, падшукаўшы месцы для зімоўкі, не маглі легчы ў спячку.

Дарэчы, паводле слоў Уладзіміра Пятровіча, у бліжэйшыя тэрміны ў краіне распачнецца штогадовы падлік дзікіх звяроў ва ўгоддзях, які звычайна праводзіцца па пакінутых імі на снезе слядах. У гэтыя выхадныя падлік пачнецца ў Брэсцкай вобласці, далей на чарзе — Віцебшчына.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Шайбу, шайбу!

## Першы кубак Палесся застаўся на радзіме

***Гомель прэтэндуе стаць хакейнай сталіцай нашай краіны: міжнародны хакейны турнір «Кубак Палесся», які днямі ўпершыню прымаў горад над Сожам, арганізатары абяцаюць зрабіць традыцыйным і сабраць большае прадстаўніцтва ўдзельнікаў. Прыемна, што першы трафей выйграла нацыянальная зборная Беларусі.***

Перад стартавым матчам Уладзімір Навумаў, старшыня федэрацыі хакея Беларусі, прызнаўся, што ідэя правесці такія спаборніцтвы існавала даўно: «Спадзяюся, што «Кубак Палесся» будзе спрыяць падрыхтоўцы ігракоў да чэмпіянату свету, а для балельшчыкаў стане сапраўдным святам хакея. Я не сумняваюся ў тым, што гэты турнір стане традыцыйным і збярэ большую колькасць каманд. Тады матчы можна праводзіць не толькі ў Гомелі, але і ў Жлобіне, дзе нядаўна быў адкрыты новы Лядовы палац. А наогул мая мара — каб кожныя выхадныя ў абласных цэнтрах былі такія ж турніры». Мэр горада Аляксандр Бяляеў пагадзіўся, што «Кубак Палесся» мае ўсе шанцы атрымаць пастаянную прапіску ў Гомелі. Дарэчы, на спаборніцтвы завітаў прадстаўнік міжнароднай федэрацыі хакея Ханс Добіда, які высока ацаніў узровень правядзення турніру і гульню беларускіх хакеістаў: «Я быў у вашай краіне, калі «Юнацтва» на апошніх хвілінах вырвала перамогу ў паўфінале Кантынентальнага кубка, стаў сведкам і таго, як мінчане выйгралі ў суперфінале па булітах. Ваша нацыянальная зборная паспяхова выступіла на чэмпіянаце свету ў Рызе і на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці, таму хачу пажадаць самага лепшага вашай федэрацыі і камандзе ў далейшым».

За першы кубак Палесся змагалася чатыры каманды, прычым самага рознага статусу — зборныя Беларусі і Латвіі, клуб расійскай суперлігі «Салават Юлаеў», а самым непрадказальным сапернікам стаў уладальнік кубка Алана, мацнейшы аматарскі клуб Канады (выступаў у форме нацыянальнай зборнай) «Паўэл Рывер Рэгалз».

Цікавасць да «Кубка Палесся» выклікала некалькі інтрыгуючых момантаў: ці зможа беларуская каманда сённяшняга ўзору ўзяць рэванш за паражэнне зборнай на кваліфікацыйным турніры ў Рызе-2005, дзе менавіта гаспадары не дазволілі нашым ігракам паехаць на зімовую Алімпіяду ў Турын-2006; ці паўплывае на зыход матча «Салават Юлаеў» — Беларусь фактар свае — чужыя (некалькі нашых ігракоў выступаюць за ўфімскі клуб). Апісваць гульні не стану, бо, спадзяюся, балельшчыкі глядзелі трансляцыі. Для тых жа, хто ў гэты час сачыў за матчамі Кубка Дэвіса, нагадаю вынікі сустрэч: «Салават Юлаеў» — Канада — 2:0, Беларусь — Латвія — 1:2 у авертайме (першы дзень турніру), Канада — Латвія — 2:9, Беларусь — «Салават Юлаеў» — 5:3 (другі дзень), «Салават Юлаеў» — Латвія — 4:3, Беларусь — Канада — 9:2 (трэці дзень). Становішча каманд: Беларусь — 7 ачкоў, «Салават Юлаеў» — 6, Латвія — 5, Канада — 0.

Лепшымі ігракамі спаборніцтваў сталі: абаронца Алег Лявонцьеў (Беларусь), галкіпер Чэд Візуці (Канада), нападаючы Лаўрыс Дарзіньш (Латвія), бамбардзір Уладзімір Копаць (Беларусь).

### ТРЭНЕРСКІЯ КАМЕНТАРЫІ ПАСЛЯ ТУРНІРУ:



Фота БЕЛТА.

__Курт ФРЭЙЗЕР (Беларусь):__

— Прыемна, што мы выйгралі. Я бачыў у раздзявальні шчаслівыя твары. Шкада толькі, што на спаборніцтвах былі траўмаваны ігракі (у саставе беларусаў Андрэй Міхалёў, Сяргей Кукушкін і Максім Цвяткоў). Рэзерв у зборнай ёсць, але праблема ў тым, што маладыя ігракі нацыянальнага чэмпіянату яшчэ не «паспелі», а вопытныя падыходзяць да ўзросту, калі хутка давядзецца завяршаць кар'еру. Зараз галоўнае — зрабіць высновы пасля турніру і перад чэмпіянатам свету.

__Алег ЗНАРОК (Латвія):__

— Матч з вашай зборнай быў цяжкім. Я ведаў, што каманда будзе змагацца пасля таго пройгрышу ў Рызе... Мы нават не думалі, што пасля цяжкай гульні з беларусамі расіяне так кінуцца ў атаку, але яны знайшлі ў сабе сілы. Праўда, пры ліку 4:0 мы змаглі супакоіцца і ўзвінціць тэмп, але выйграць не ўдалося ні ў апошнім матчы, ні на турніры.

__Сяргей МІХАЛЁЎ («Салават Юлаеў»):__

— Мы прыехалі, каб падрыхтавацца да рашаючай стадыі нашага чэмпіянату. Заўважу, што беларус Чупрыс быў адным з лепшых у нашай камандзе. Магчыма, трэба перанесці матчы з Уфы ў Гомель, каб ён так добра выступаў далей?

__Тод ІНГЛІШ (Канада):__

— Мы атрымалі вялікую асалоду прадстаўляць сваю краіну ў Беларусі і згуляць з камандай пад кіраўніцтвам майго калегі з суседняга пабярэжжа (аб Курце Фрэйзеры). Наш траўмаваны ігрок нават сказаў, што з задавальненнем застанецца ў вас яшчэ на некалькі дзён.

### СВАЕ — ЧУЖЫЯ?

__Яраслаў ЧУПРЫС («Салават Юлаеў»):__

— Лічу, што турнір прайшоў на высокім ўзроўні. Мне ён спадабаўся: тры шайбы закінуў, чаму не спадабаецца?

**— Які матч паказаўся самым складаным?**

— Канешне ж, са сваімі, з беларусамі, бо такое ў мяне было ўпершыню, каб гуляў супраць сваёй зборнай. Я не засмучаюся, што мяне не выклікалі ў нацыянальную каманду і давялося гуляць за свой клуб. Я размаўляў з беларускім трэнерам: быццам ніякіх праблем са мной няма, вясной буду рыхтавацца да чэмпіянату свету.

**— Зборная Беларусі ўступіла камандзе Латвіі, а ваша дружына выйграла ў іх. Як пракаментуеце?**

— Значыць, на сённяшні момант «Салават Юлаеў» мацнейшы за зборную Беларусі (*смяецца*). Не, аб чым мы тут гаворым! Гэта ж хакей: калі хтосьці прайграе нейкай камандзе, гэта не адлюстроўвае расстаноўку сіл, тым больш, што розніца шайбаў не надта вялікая. Напрыклад, у канцы нашай сустрэчы з латышамі яны маглі нас дабіць, пачаліся выдаленні.

__Дзмітрый МЯЛЕШКА («Салават Юлаеў»):__

**— На турніры вы ў адрозненне ад Чупрыса гулялі за зборную Беларусі. Наколькі было цяжка выходзіць на лёд супраць свайго клуба?**

— Цяжка. Сваіх жа нельга ўдарыць (*усміхаецца*), ды і яны, мяркую, таксама не могуць гуляць груба.

**— Перад матчам «Салават Юлаеў» — Латвія вы прасілі аднаклубнікаў дапамагчы (менавіта перамога расіян не дазволіла латышам выйграць на турніры)?**

— Яны самі настройваліся на перамогу, ды і мы ў кожнай сустрэчы змагаліся, як маглі, бо прыехалі ў Гомель за кубкам. Канешне, яшчэ, каб найграць розныя схемы і саставы.

**— У зборную не прыехаў некалькі вядучых ігракоў. За кошт чаго ўдалося-такі выйграць Кубак Палесся?**

— Наша каманда моцная не саставам, а адзіным духам. Не мае значэння, хто выходзіў на лёд: ва ўсіх нас была адна мэта — перамагчы.

__Канстанцін КАЛЬЦОЎ, капітан зборнай Беларусі («Салават Юлаеў»):__

**— Што ў вашай гульні змянілася пасля таго, як сталі капітанам?**

— Адчуваю большую адказнасць, імкнуся падбадзёрваць ігракоў у цяжкія моманты, размаўляць па душах.

**— Анекдоты расказваеце, каб зняць напружанне?**

— Пакуль не. У нас традыцыя: рэгулярна за дзень да гульні на чэмпіянаце свету збіраемся камандай і дзеля псіхалагічнага расслаблення расказваем смешныя гісторыі. Зараз якраз займаюся падборкай жартаў і анекдотаў.

**— Што, на вашу думку, не хапае «Кубку Палесся», каб турнір стаў традыцыйным і сапраўды прыносіў карысць?**

— Хацелася б, каб сярод удзельнікаў былі славакі, немцы, швейцарцы. Калі такія каманды змогуць прыехаць, не толькі ўзровень спаборніцтваў, але і нашай зборнай будзе расці, ды і для гэтых каманд, спадзяюся, будзе цікава. Магчыма, запрасіць у Гомель некалькі лідараў расійскай суперлігі з Омска, Казані, Магнітагорска.

**— Хто з сапернікаў найбольш здзівіў?**

— Хутчэй за ўсё «Салават Юлаеў», бо ў іх быў аслаблены састаў: шмат траўмаваных ігракоў.

**— Крыўдна, калі шайбы ў беларускія вароты закідвалі свае хакеісты, якія выступалі за клуб з Уфы?**

— Кожны выконвае сваю працу. Якая можа быць крыўда?

**— Чаму не змаглі выйграць у латышоў?**

— Занадта хваляваліся і хацелі перамагчы, а латышы цудоўна згулялі ў абароне, у прыватнасці галкіпер.

__Уладзімір КОПАЦЬ, лепшы бамбардзір турніру («Юнацтва-Мінск»):__

— Гэты турнір дапамог праверыць нашы сілы, што вельмі важна, бо да чэмпіянату свету засталося не так шмат часу. Сапернікі ў нас былі, як на падбор. Канаду хоць і прадстаўляла аматарская каманда, але яны выступілі вельмі добра, завязалі барацьбу. Канадцы заўжды канадцы! «Салават» — адзін з лідараў суперлігі, а латышы — ці не самы прынцыповы сапернік? Прыемна, што мы выйгралі першы кубак, але галоўны турнір наперадзе — чэмпіянат свету.

**— Некаторыя беларускія ігракі казалі, што самым цяжкім матчам для іх стала гульня супраць «Салавата», за які выступаюць беларусы. А для вас?**

— У мяне столькі матчаў было, што паняцця «свае — чужыя» ў мяне няма. На лёд выходжу толькі супраць сапернікаў і заўжды хачу перамагчы. Цяжка не таму, што супраць беларусаў, а што гульня атрымалася складаная.

**— Чаго не хапіла на турніры?**

— Многіх ігракоў не хапае, каманднай гульні. Будзем працаваць над гэтым. Час яшчэ ёсць. Усё адразу не атрымліваецца: у нас новы трэнер, патрэбна прыцэрціся да яго патрабаванняў. У яго тактыка сілавога ціску, што патрабуе лепшых фізічных кандыцый.

**Ірына ПРЫМАК.**
*Мінск — Гомель — Мінск.*

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск
аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376
№ 6(538)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### Прадаецца

■ Дом вялікі з г/п, участак 60 сотак, сад у вёсцы, 10 км ад Салігорска, добрыя мясціны.
Тэл.: (8-01710) 616-45, 8-029-320-90-78.

■ Кватэра ў будуемым 2-кватэрным доме з магазінам-майстэрняй (11 км ад Брэста), пастаянная сумесная справа.
Тэл. 8-029-601-69-81.

■ Хата драўляная, пячное ацяпленне, вялікі сад, зямельны ўчастак у в. Касмовічы Нясвіжскага раёна.
Тэл. 8-029-557-06-63.

■ Дом памерам 12х5, г/п, лазня, зямельны ўчастак, склеп, сад у в. Дуброўка Бярэзінскага раёна.
Тэл. (8-02137) 2-91-49.

■ Дом недабудаваны, зручны для перавозу, вялікі сад, тэлефон у в. Каменка Шчучынскага раёна.
Тэл. (8-01514) 3-45-47.

■ Дом у в. Бабаевічы, 1 км ад г. Клецка, маюцца г/п, участак 25 сотак, добры стан.
Тэл. (8-01793) 4-27-68.

■ Дом з г/п 20 км ад г. Слуцка, маецца водаправод, склеп, гараж, участак 20 сотак, сад.
Тэл. 8-029-339-48-85.

■ «VW-гольф», 1987 г.в., 1,6Д, трохдзверны, люк, фаркоп, чырвоны, выдатны стан.
Тэл. (8-029) 209-85-20.

■ «Масквіч-2141», 1992 г.в., 1,5 л, газ-бензін, 600 у.а.
Тэл. 8-029-702-15-43.

■ «Пежо-405», 1992 г.в., 1,9Д, цёмна-шэры металік, седан, ц/з, ABS, сігналізацыя, новая гума, 5-КПП. 3100 у.а., торг.
Тэл. 8-029-773-45-10.

■ Гараж у Мінску па вул. Трасцянецкай, падвал, ахова.
Тэл. 8-029-654-11-62.

■ Мяняю электрамлын на раму навясной 2-радковай бульбакапалкі.
Тэл. 8-029-931-82-28.

■ Мабільны тэл. «Нокіа»-6030, б/к, гарантыя.
Тэл. (8-017) 276-18-74.

■ Цялежка будаўнічая да 70 кг, каляровы прынтар.
Тэл. (8-01593) 4-03-93.

■ Трактар МТЗ-80 з навясным абсталяваннем.
Тэл. (8-01774) 5-81-27.

■ Газавая пліта «Гефест» новая, ва ўпакоўцы,
Тэл.:(8-017) 295-96-84, 8-029-654-11-62.

■ Трактар «МТЗ-80», прычэп 2 ПТС-4, плуг ПГН-3, бульбасаджалка, культыватар, акучнік.
Тэл. 8-029-312-73-92.

■ Электрапліта 4-канфорачная новая, танна.
Тэл. 8-029-931-82-28.

### Куплю

■ ГАЗ-3307 53«Б» самазвал, бензін, у добрым стане.
*Тэл. (8-01634) 81-429, 8-029-639-84-14.*

■ Матаблок МТЗ.
*Тэл. 8-029-4000-852.*

■ Трактар МТЗ.
*Тэл. 8-029-655-07-16.*

■ Прычэп да л/м.
*Тэл. 8-029-339-48-85.*

■ «Пежо-405» аварыйны ці на з/ч.
*Тэл. (8-01710) 3-10-11.*

■ «VW», «Аудзі» можна з невялікімі дэфектамі.
*Тэл. 8-029-773-45-10.*

*Ад усёй душы віншуем з юбілеем* **Уладзіміра Іванавіча ГУСАКА** *з в. Бязверхавічы Слуцкага раёна. Зычым шчасця, здароўя без лекаў, дабра і спакою і доўгага веку.*

**З любоўю жонка, дзеці.**

*Віншуем з юбілеем паважаную* **Ніну Валяр'янаўну ВОЎК** *з в. Залужжа Стаўбцоўскага раёна. Зычым здароўя, жаночага шчасця, няхай не мінуюць ніколі ўдачы, хай сэрца заўжды застанецца гарачым.*

**Калегі.**

**Ніну Мікалаеўну ЛІТВІНКО** *з г. Жыткавічы шчыра віншуем з юбілеем. Зычым моцнага здароўя, міру, дабра і сямейнага шчасця.*

**Цётка Каця і яе сям'я, в. Востраў.**

*Віншуем з 60-годдзем* **Канстанціна Фёдаравіча БЛУСЯНКОВА** *з г. Гродна.*
*Зычым сонечнага неба, сяброў надзейных за сталом,*
*І каб жыццё было сагрэта*
*Усмешкай, радасцю, дабром.*

**Блусянковы—Шкульковы, г. Мінск.**

*Любую жонку, дарагую матулю і бабулю* **Людмілу Анатольеўну БУРАК** *з Капыля віншуем з юбілеем. Зычым шчасця і здароўя, віруюць хай крынічак сілы, і кожны дзень, табой пражыты, хай будзе радасным і мілым.*

**Родныя.**

**У суд Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак ***Сейткова Уладзіміра Юр'евіча***, 13 чэрвеня 1953 года нараджэння, ураджэнца г. Волхаў Ленінградскай вобласці, прапісанага па адрасу: в. Варонічы, дом 163, Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра ва У.Ю. Сейткова, паведаміць іх суду Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.



Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Кватэрнае пытанне

## Банкаў — шмат...

**Мы з мужам жывём у маленькай двухпакаёўцы і пра пашырэнне жылплошчы, напэўна б, не думалі, але свекру 75, свекрыві — 72. Здароўе ў абодвух слабое: не сёлета дык налета, не выключана, некага з іх, ці абодвух, давядзецца забіраць да сябе. Да гэтага мы хацелі б падрыхтавацца — пабудаваць ці купіць большую кватэру. Ведаем, што льготныя крэдыты чаргавікам выдае наш Ашчадны банк. А звычайныя? Якія банкі? На якіх умовах? (На чарзе на жыллё мы не стаім.)**

**Ірына С.**, *Магілёў.*

Як патлумачыў член праўлення грамадскага аб'яднання «Вехі» Віктар Савіцкі, такія крэдыты выдаюцца і Ашчадным банкам «Беларусбанк» і шэрагам іншых банкаў (Белаграпрамбанк, Белпрамбанк, Белінвестбанк і інш.).

Умовы крэдытавання перыядычна мяняюцца, таму аб дзеючых (на дату звароту ў банк) можна даведацца ў адпаведных філіялах канкрэтных банкаў.

Да прыкладу, у Белаграпрамбанку ў снежні 2006 года грамадзянам, якія не стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, памер крэдыту складаў да 75 працэнтаў ад кошту будаўніцтва, тэрмін крэдытавання — да 15 гадоў, стаўка па крэдыту ў беларускіх рублях — 17 працэнтаў і ў доларах ЗША — 13 працэнтаў гадавых.

У Белпрамбудбанку такі крэдыт можна было атрымаць у памеры да 70—90 працэнтаў ад кошту, на тэрмін да 10 гадоў і пад 15,5 працэнта гадавых у беларускіх рублях (14 працэнтаў — у доларах ЗША).

Белінвестбанк выдаваў такія крэдыты ў беларускіх рублях пад 15 працэнтаў гадавых (у доларах ЗША — пад 14 працэнтаў), на тэрмін да 15 гадоў і ў памеры да 80 працэнтаў кошту будаўніцтва.

### Што бачу

*...Нібы лісты,*
*Адарваныя ад родных галінак*
*Парывамі моцнага ветру,*
*Плывуць па жыцці людзі,*
*Кружаць яны*
*У вірлівых танцах —*
*То пабраўшыся ў пары,*
*А то — у адзіноце...*
*Але пры гэтым заўсёды*
*Мараць*
*Адшукаць*
*Надзейных партнёраў.*

**Алена ПАЖОГА,**
*в. Абруб, Глыбоцкі раён.*

Лініі жыцця

# КАХАННЕ І ГРОШЫ

**ПЕРАКАНАНА: жыццё піша куды больш адмысловыя сцэнарыі, чым аўтары вядомых серыялаў. Наконт іншага сюжэта так і хочацца ўсклікнуць: «Ды не можа быць!» Але — можа. І бывае...**

Яны былі знаёмы са школы, і хоць кажуць, што дзіцячае каханне — да першай зоркі, іх пачуццё гэтага лёсу пазбегла. Яны добра закончылі школу, разам паступілі ва ўніверсітэт, праўда, на розныя факультэты. Але на заняткі, да дому, на студэнцкія вечарыны, дыскатэкі хадзілі заўсёды разам і ўвогуле праз віхуру шматлюднага студэнцкага жыцця бачылі толькі аднаго адзінага. Калі гэта не каханне — дык што?

Парай яны былі адметнай: ён, Арцём, — вялікі, дужы, русавалосы, яна, Алена, — падобная на ўсходнюю прыгажуню — танюткая, з вялікімі карымі вачамі. А яшчэ — яны былі сучаснай парай. І таму не луналі ў прыгожых марах кахання, а цвяроза планавалі далейшае сумеснае жыццё: скончыць універсітэт, знайсці добрую працу ў вялікім горадзе (а няхай і ў расійскім...), купіць кватэру (першую — можна танную, «мікрараённую», другую — ужо шыкоўную, у цэнтры). Ну а потым падумаць пра дзетак.

Запланавана — зроблена. Пасля заканчэння ўніверсітэта Арцём паехаў у Маскву. Уладкаваўся выдатнік-біёлаг вельмі ўдала: у невялікую, але прыбытковую фірму па вытворчасці харчовых прадуктаў. Неблагія грошы праз нейкі час дазволілі купіць першую кватэру — аднапакаёўку ў прыгарадзе. І «выпісаць» да сябе каханую...

Праўда, афіцыйна аформіць шлюб маладыя не спяшаліся — умяшаліся, як кажуць, незапланаваныя абставіны. Былы калега прапанаваў Арцёму стаць саўладальнікам новай фірмы і параіў частку набыванай уласнасці перавесці на Алену. Маўляў, калі што — з неафіцыйнай жонкі браць няма чаго. Другія нечаканыя акалічнасці ўзніклі з боку Аленіных бацькоў. Яе маці па жаночай лініі паходзіла з паволжскіх немцаў і знайшла раптам сваякоў у Германіі. З'ездзіла да іх, агледзелася і... вырашыла перабрацца ў Нямеччыну на пастаяннае месца жыхарства, прыхапіўшы з сабою мужа і дачку, якой, і менавіта незамужняй, як папярэдзілі сваякі, лепей, лягчэй будзе прайсці доўгую працэдуру атрымання грамадзянства...

Да таго ж, адсутнасць штампа ў пашпарце ніколькі не бянтэжыла гэту пару: да асалоды ад кахання далучыўся новы прысмак — добрых грошай, якія дазвалялі паехаць адпачываць за блізкі свет, пагуляць у шыкоўных рэстаранах, завесці «зімовую» і «летнюю» машыны...

Але за радасцямі жыцця нашы маладыя не забываліся на цвярозыя планы. Паколькі Алене для атрымання грамадзянства трэба было з'ехаць у Германію і амаль на год, было вырашана, што паехаць яна павінна не адна. А з ...будучым дзіцяткам, каб там нарадзіць і запісаць. Аднак менавіта гэты прыемны план «выконвацца» не жадаў. Прасадзіўшы амаль новую іншамарку на аналізы, кансультацыі, дарагіх урачоў і клінікі, Алена прыйшла да пажылой дакторкі раддома. І тая, уважліва прагледзеўшы паперкі, уздыхнула: «Тое, што вы з мужам здаровыя і можаце мець дзетак — сумненняў не выклікае. Але... Хочаце верце, хочаце — не, а прыродзе чамусьці не падабаецца, калі «дзіцячае пытанне» адкладаюць. А тым больш — надоўга. У мяне вельмі шмат такіх пацыентак... Дасць Бог — і ў вас будзе дзіцятка. Але, калі ўсё ж такі зацяжараце, яно павінна радзіцца. Пры любых абставінах... Зразумела?»

... Да бацькоў Алена паехала адна. Першыя тыдні думала, што звар'яцее — не хапала прасторы, паветра, сяброў і, вядома ж, Арцёма. Той быў загружаны справамі, нават SMS-кі ад яго былі кароценькімі і дзелавымі, быццам пісаў іх не каханай жанчыне, а партнёру па бізнэсу. Ён не разумееў яе настрою. Кожны раз пасля «сумнага званка» пераводзіў на картку грошы — каб магла аплаціць «усе радасці жыцця». А якія радасці? Курсы нямецкай мовы, вузкае кола чужых — хоць і былых суайчыннікаў, што збіраліся па выхадных у маленькім садку Аленіных бацькоў «на шашлыкі»?..

У адзін з цёплых еўрапейскіх восеньскіх вечароў там з'явіўся сын суседзяў — невысокі чорнавалосы чалавек, крыху старэйшы за Алену...

Не было ў іх ніякіх рамантычных сустрэч, падарункаў, заляцанняў — толькі страсць, якая можа ўзнікнуць паміж маладымі здаровымі мужчынам і жанчынай на нейкім дзікім востраве. А яны ж жылі менавіта на ім?

Страсць скончылася праз два месяцы, калі Алена адчула, што зацяжарала, і сказала пра гэта бацьку будучага дзіцяці. Той адрэагаваў, як у дрэнным серыяле — маўляў, ад малога ён не адмаўляецца, але што ён гэтым можа даць?.. Яму... Алене, якая прывыкла да раскошы і камфортнага жыцця? Ну, хіба, пазней, у перспектыве, калі атрымае грамадзянства і ўладкуецца на працу...


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Значыць, пазбавіцца трэба ад гэтай цяжарнасці? Але ж нямецкі ўрач падцвердзіў словы той маскоўскай дакторкі: калі фройлен адважыцца на непрыемную аперацыю, то дзетак больш можа не мець — такая ў яе паталогія. І гэта азначала... Гэта азначала паставіць крыж на сваім жаночым шчасці, на сямейным жыцці і Арцёме.

Дарэчы, пра Арцёма, які збіраўся да іх праз два месяцы на Ражство, Алена нават думаць баялася. Як паглядзець яму ў вочы, што сказаць, патлумачыць?

Яны з мамай плакалі па начах і шукалі выйсце. Пабыць з Арцёмам на святы, а потым абрадавацца, што зацяжарала? Аднак неданошанае, а тым больш пяцімесячнае немаўля немагчыма пераблытаць з данашаным, тым больш выдатніку-біёлагу. Сказаць праўду? Але Арцём ніколі не даруе... А значыць, ніколі больш яны не будуць разам, не паедуць за блізкі свет, не пабудуюць уласны дом... Алена раптоўна адчула, як гэта жудасна — страціць не толькі Арцёма, але і створаны ім лад жыцця. Бесклапотнага, заможнага, вольнага...

У гісторыю, якую яны з маці «сачынілі», не павінен быў паверыць нават чалавек з незавершанай пачатковай адукацыяй. У Алены, маўляў, узніклі складаныя «жаночыя» праблемы, прыйшлося класціся на тэрміновую аперацыю. Потым ёй сказалі, што дзеля захавання рэпрадуктыўнага здароўя трэба тэрмінова падумаць аб цяжарнасці. А паколькі Арцём далёка, і не званіў, не пісаў, не звяртаў увагі на яе настрой, Алена згадзілася на «штучную».

Арцём гэту легенду «праглынуў». І на дзіва спакойна. Зрэшты, чаму на дзіва? Алена здагадвалася, што не толькі (а можа, і не столькі) каханне прымусіла яго прыняць гэту лухту за праўду. Яму патрабавалася замежнае грамадзянства — «запасны аэрадром» на ўсякі выпадак... На жонку была пераведзена частка маёмасці і ўкладаў... Адным словам, «легенда» аказалася зручнай для іх абаіх.

Планы мяняць яны таксама не сталі: напрыканцы зімы Алена атрымала замежны пашпарт, на пачатку вясны яны распісаліся. У маі нарадзіўся «штучны» сынок — маленькая, дзякаваць Богу, кропелька Алены. Арцём упершыню ўбачыў малога, калі таму споўнілася два месяцы. На рукі за тыдзень ўзяў аднойчы — калі прыходзілі суседзі з віншаваннямі. Казаў, што да восені скончыць рамонт у маскоўскай кватэры і забярэ Алену з малым.

Аднак мінула восень, амаль скончылася зіма... Алена па-ранейшаму жыве ў бацькоў. Арцём кажа, што ніяк не можа давесці да ладу жыллё — не хапае часу. Шле грошы, мабільныя карацелькі. Абяцае прыехаць. Абодва робяць выгляд, што ўсё паміж імі па-ранейшаму...

Сяброўкі, якія засталіся ў Маскве і на гістарычнай радзіме, Алене па-добраму зайздросцяць. Вакол толькі і размоў аб сямейных скандалах, гучных разводах, здрадах і шлюбах з «фінансавым» падтэкстам — а тут трывалае каханне, дружная сям'я, жыццё, што складаецца як па нотах. Алена слухае іх моўчкі.

Праўду яна не кажа. Нават самой сабе.

**Надзея ПЛЯСКОВА.**

## Хочаце — верце...

Вынесці тэлевізар з дому, дзе растуць малыя дзеткі, раяць некаторыя заходнія вучоныя. Падставай для безапеляцыйнай рэкамендацыі сталі сенсацыйныя даследаванні сярод маладых беспрацоўных і тых юнакоў і дзяўчат, якія паспяхова ўладкаваліся ў жыцці — добра вучыліся, знайшлі прыстойную працу і г.д. Аказваецца, апошнія глядзелі ў дзяцінстве тэлевізар не больш за адзіну гадзіну ў тыдзень! А некаторыя і ўвогуле раслі ў сем'ях, дзе «скрыні» не было...

І наадварот, абсалютная большасць беспрацоўных гадавалася, як кажуць, не адрываючыся ад экрана.

Паводле ацэнк экспертаў, 10 гадзін тэлесеансаў у тыдзень паніжаюць творчы патэнцыял на чвэрць. Дзве штодзённыя гадзіны перад экранам «крадуць» да паловы творчых здольнасцяў асобы. Калі дашкольнік глядзіць тэлевізар па тры і болей гадзіны на дзень, ён страчвае да 90 працэнтаў сацыяльнай актыўнасці!

Таму псіхолагі настойліва не рэкамендуюць дзецям да 4-гадоў глядзець тэлеперадачы (нават мульцікі!) увогуле. Пасля 6 гадоў перад тэлевізарам пажадана праводзіць не больш за адну гадзіну ў тыдзень, у 10-гадовым узросце — 2—3. І толькі для 16-гадовых абмежаванні ўжо не істотныя — яны амаль сфарміраваліся як асобы.

Мама, пачытай!

## Жудасная казка

Ля дзвярэй зубнога лекара нудзілася барана — прыйшла выдраць хворы, заіржавелы зуб.

Пакуль чакала, прыкаціла ды зажурылася побач гадзіннікавае колца з пагнутым зубчыкам. У куточку — прытуліўся грабянец... Без двух зубоў — зламаліся. Потым, стараючыся не тупаць, з'явіўся зубец з крапаснога мура — пломбу паставіць...

Раптам дзверы кабінета адчыніліся — адтуль выбеглі граблі. Услед за імі — узніклі агромністыя абцугі.

— Калі ласка, наступны! — ляснулі яны.

— Барані мяне Божа! — бразнула барана.

Раптам — іржа з яе аблупілася, боль — знік. І яна кінулася баранаваць.

**Іля ШАХРАЙ,** *г. Мінск.*

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.35 | 17.14 | 9.39 |
| Віцебск — | 7.28 | 17.00 | 9.32 |
| Магілёў — | 7.25 | 17.04 | 9.39 |
| Гомель — | 7.17 | 17.05 | 9.48 |
| Гродна — | 7.49 | 17.30 | 9.41 |
| Брэст — | 7.46 | 17.35 | 9.49 |

### Месяц

***Апошняя квадра 10 лютага. Месяц у сузор'і Казярога.***

### Імяніны

***Пр.*** *Віктара, Івана, Кіра, Клаўдзія, Мікіты, Нікіфара;* ***К.*** *Арлеты, Катарыны, Рыгора, Юльяна.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература | Ападкі | Горад | Тэмпература | Ападкі |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | 0 — +2 °C | | МАСКВА | -2 — 0 °C | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | -1 — +1 °C | | РЫГА | -5 — -3 °C | |
| КІЕЎ | +1 — +3 °C | Без ападкаў | С-ПЕЦЯРБУРГ | -9 — -7 °C | Без ападкаў |

## 13 лютага

*Дзве даты*

**1949 год** — у Эквадоры раз'юшаны натоўп спаліў радыёстанцыю пасля ўсеагульнай панікі, выкліканай трансляцыяй пастаноўкі «Вайны светаў» паводле рамана Г. Уэлса.



**1937 год** — на базе мінскага тэхнікума фізічнай культуры заснаваны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры (з 1992 года — Акадэмія фізічнага выхавання і спорту). Выпускнікі гэтай навучальнай установы неаднаразова заваёўвалі званні чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы.

*Цытата дня:*

***«Мне не патрэбен сябар, які, ва ўсім са мною пагаджаючыся, са мною ж мяняе погляды, ківаючы галавой. Мой уласны цень робіць гэта значна лепш».***

**Плутарх (46—119),**
**старажытнагрэчаскі гісторык і пісьменнік.**

## УСМІХНЁМСЯ!

**Грукат малатка з дзіцячага пакоя. Маці:**

**— Паша, ты што там майструеш?**

**— Ды так, манітор раман-тую...**

☺

Аб'ява. Хуткае пахудзенне! Да 15 кілаграмаў за адзін тыдзень! Штодзённы курс па 14 гадзін пад наглядам вопытнага прараба.

☺

**У мужыка ў сям'і пяць дачок. Звоніць тэлефон, ён здымае трубку:**

**— Алё, гэта ты, мая рыбка?**

**— Не, гэта гаспадар акварыума.**

☺

Снегапрыбіральны трактар — гэта такі цуда-агрэгат, у якога спераду нож, каб трамбаваць снег, а ззаду шчотка, каб рабіць яго слізкім.

☺

**— Якая смачная салата, дарагая? Сама купіла?**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное **по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32**, сообщает о проведении **22 февраля 2007 г**. Общего собрания акционеров в заочной форме.

На собрание выносится вопрос о предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры банка могут ознакомиться с необходимой информацией и заполнить бюллетень для заочного голосования ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, **с 9.00 до 13.00 в течение семи дней со дня опубликования данного сообщения по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».**

Бюллетень для заочного голосования предоставляется не позднее 19 февраля 2007 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6., ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8-017) 209–25–48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

**Дополнительная информация по телефонам: (8–017) 209–24–21, 209–25–40.**

Крымінал

## Іншаземец «пракурыў» 60 млн

**Беларускімі праваахоўнікамі затрыманы грузавы аўтамабіль «Вольва» з паўпрычэпам, у якім перавозілася кантрабанда.**

Кіраваў грузавіком грамадзянін Польшчы, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-цэнтры Камітэта дзяржкантролю. Супрацоўнікі ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў па Магілёўскай вобласці сумесна з АБЭЗ Кастрычніцкага РАУС Магілёва знайшлі ў аўто 77,9 тысячы пачкаў расійскіх цыгарэт: тавар не меў акцызных марак і перавозіўся без суправаджальных дакументаў. На тытунёвыя вырабы, кошт якіх склаў каля 60 мільёнаў рублёў, накладзены арышт. А вось работнікі Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці разам з пагранічнікамі затрымалі жыхарку Гродна, якая захоўвала ў гаражы 363 пяцілітровыя ёмістасці спіртазмяшчальнай вадкасці на 7,2 мільёна рублёў, 4540 пачкаў імпартных цыгарэт без акцызных марак на 3,4 мільёна рублёў, 66 бутэлек алкагольных напояў на 0,6 мільёна. Падакцызная прадукцыя канфіскавана.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## «ЛЁГКІХ» ЦЫГАРЭТ НЕ БЫВАЕ

**У межах рэалізацыі палажэнняў Рамачнай канвенцыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў барацьбе супраць тытуню Дзяржстандарт, канцэрн «Белдзяржхарчпрам», Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства гандлю прапанавалі ўнесці змяненні ў дзяржаўныя стандарты, якія ўстанаўліваюць патрабаванні да ўпакоўкі і маркіроўкі тытунёвых вырабаў у 2007 годзе.**

Забараняецца выкарыстанне такіх тэрмінаў, якія могуць ствараць уражанне, быццам пэўны тытунёвы выраб з'яўляецца менш шкодным, чым іншыя — «лёгкія», «вельмі лёгкія», «з нізкім утрыманнем смол», «мяккія» і г.д. Прадугледжаны дадатковыя патрабаванні да надпісаў, якія папярэджваюць аб шкодзе курэння: яны будуць займаць ад 30 да 50 працэнтаў плошчы і іх змест будзе мяняцца. На змену добравядомай фразе «Мінздраў папярэджвае» прыйдуць больш праўдзівыя, якія напрамую ўказваюць на ўзаемасувязь паміж курэннем і развіццём ракавых захворванняў. Запатрабуюць ад вытворцаў і інфармацыі аб складзе тытунёвых вырабаў або аб прадуктах, якія яны вылучаюць.

Канцэрн «Белдзяржхарчпрам», дарэчы, працягвае работу па скарачэнню аб'ёмаў вытворчасці цыгарэт з высокім утрыманнем смол і нікаціну, у тым ліку цыгарэт без фільтра.

Вядома, што ва ўсіх адміністрацыйных і грамадскіх будынках для курцоў павінны адводзіцца асобныя памяшканні. Прапрацоўваецца і пытанне стварэння, скажам, рэстарана ці кінатэатра для тых, хто не курыць.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# КЛЁВА!



### НА ЛЮБЫ ГУСТ

**(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 7 лютага.)**

**Балансір Lindross Hali Taky** — самая мініяцюрная прынада з



тых, якія праходзілі тэсціраванне, ды і наогул з усіх больш-менш якасных «гарызанталак». Цікава наяўнасць падвяснога трайніка на такой «малютцы». Дыяметр балансіра ў самай шырокай яго частцы складае ўсяго 4 міліметры, гэта значыць, што ён з'яўляецца непрапарцыянальна тонкім. Невялікі валасяны хвосцік забяспечвае даволі стабільную гульню. Перакручванні трайніка не адзначаны. Змена ці проста зняцце трайніка магчыма толькі пры дапамозе інструмента.

**Балансір «Эко».** Усе тэставыя мадэлі паказалі стабільную



работу. Разварот у крайняй кропцы ў дзвюх маленькіх мадэляў даволі хуткі, а вось буйная мадэль частку «шляху назад» праходзіць хвастом уперад. Усе прынады допускаюць магчымасць устаноўкі трайніка, але для мацавання ўстаноўлена замкнутае кольца. Таму трайнік можна замацаваць толькі праз завадное кольца (ці спецыяльную засцежку — што не лепш), а гэта часта прыводзіць да перакручванняў. Кручкі са слабым адгінам ад восі прынады (больш складана падсякаць, але, калі падсек — менш сходаў).

**Балансіры Kostal.** З пяці тэставых прынад толькі дзве валодаюць добрай гульнёй. Ці то ў Поль-



шчы балансірамі карыстаюцца паіншаму, ці то зроблены яны без тэсту на працаздольнасць. Два балансіры (39 мм і 43 мм) працуюць стабільна і хутка разварочваюцца. Астатнія тры проста не працуюць. Тыя, якія не маюць ніякага хваста, наогул цяжка аднесці да балансіраў, таму што пры падрыгванні яны проста падскокваюць уверх. А 30-міліметровая мадэль валодае занадта вялікім для свайго памеру хвосцікам, што прыводзіць да блытанасці ў гульні, і працаваць з такой прынадай можна толькі абрэзаўшы хвост. Усе мадэлі пазбаўлены магчымасці ўстаноўкі падвяснога трайніка. Кручкі сярэдняй якасці, жала паралельныя падоўжанай восі прынады, што вельмі дрэнна для гэтага тыпу прынады. Што вельмі якаснае ў гэтых балансіраў, дык гэта афарбоўка.

**Балансір Salmo** — якасная прынада, якая мае вельмі стабільную гульню. Разварот у верх-



няй кропцы практычна без спазнення. Афарбоўка якасная. Кручкі сярэдняй якасці. Пярэдні мае нармальны адгін ад восі прынады, а вось задні кручок практычна паралельны восі. Трайнікам гэтая прынада не аснашчаная, але мае засцежку. Яна спадручная, але крыху даўгаватая, што прыводзіць да некаторай колькасці перакручванняў трайніка пры ўстаноўцы кручка крыху большага нумара.

**Балансір «Аква».** Адзін з лепшых балансіраў сваёй цэнавай групы. Стабільная праца практычна поўнасцю паўтарае гульню Nils Master. Пастаноўка кручкоў правільная, з дастатковым адгінам. Адзіным недахопам з'яўляецца не вельмі высокая якасць гэтых кручкоў.



**Балансір Kuusamo.** Акрамя вельмі невялікага спазнення пры развароце ў верхняй кропцы тра-



екторыі, другіх недахопаў не выяўлена. Якасныя кручкі і правільнае размяшчэнне, стандартная засцежка трайніка, яркая, таксама якасная афарбоўка.

Майстэрня

## БІРУЛЬКА РЫБАЛОВА «FISHER.RU»

Рыбацкую бірульку з выявай якога-небудзь шчупака можна купіць у магазіне. Але гэта будзе не зусім сапраўдная бірулька рыбалова. Мы навучым вас, як за 3 хвіліны зрабіць сабе такую бірульку для ключоў, якая будзе:

а) вельмі спадручнай,

б) не даступнай ні ў адным магазіне ні за якія грошы,


Фота 1

в) арыгінальнай.

Акрамя таго, гэта будзе сапраўдная бірулька рыбалова, і любы рыбак імгненна пазнае ў вас калегу, толькі зірнуўшы на ключы.

Такім чынам, вам спатрэбяцца:

- адно завадное кольца,
- карабіны сярэдняга памеру з вяртлюжкамі па колькасці вашых ключоў, плюс адзін для аксесуара.

Збярыце карабінчыкі на кольцы, як паказана на **фота 1.** Потым замацуйце да кожнага карабіна па ключу. Свабодны карабін выкарыстайце для міні-набору інструментаў тыпу Leatherman Micra, SOG Кросскат, як на **фота 2**, ці падвесьце туды тачылку для кручкоў, кусачкі для лёскі або


Фота 2

які-небудзь патрэбны для рыбалкі дробны аксесуар.

Чаму гэтая канструкцыя спадручная?

а) калі вы круціце ключ у замочнай шчыліне, астатняя звязка не круціцца разам з ім дзякуючы вяртлюгу,

б) любы ключ ці аксесуар пры неабходнасці лёгка можа быць зняты і замацаваны назад, што бывае асабліва дарэчы для вадзіцеляў,

в) звязка ключоў на такой падвесцы размяшчаецца ў кішэні значна больш кампактна, чым, калі яна сабраная на звычайным кольцы,

г) колькасць ключоў, аксесуараў і іншых прыбамбасаў у адной звязцы не абмежаваная.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

**html:** www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 837. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**